# Аб маштабах нацысцкага эканамічнага генацыду беларускага сялянства ў 1941–1944 гадах

УДК 94(476) «1941/1944»



Сяргей НОВІКАЎ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Сяргей НОВІКАЎ. Аб маштабах нацысцкага эканамічнага генацыду беларускага сялянства ў 1941–1944 гадах. У артыкуле аўтар раскрывае наступствы нацысцкага эканамічнага генацыду ў дачыненні да беларускага сялянства. Выкарыстанне малавядомай крыніцазнаўчай базы, галоўным чынам нямецкага паходжання, і актуальных навуковых даследаванняў, у тым ліку замежных, ствараюць новыя магчымасці для аб'ектыўнага паказу трагічных аспектаў гісторыі разбурэння беларускай вёскі, эканамічнай эксплуатацыі і згубы яе мірнага насельніцтва ў ходзе правядзення захопнікамі карных аперацый і знішчэння поўнасцю ці часткова яе жыхароў у гады германскай акупацыі Беларусі 1941–1944 гадоў.
Ключавыя словы: беларускае сялянства, вясковыя жыхары, генацыд, грамадзянскае насельніцтва, нацысцкая палітыка, эканамічны генацыд.

Siarhei NOVIKAU. About the Nazi economic genocide of the Belarusian peasantry in 1941–1944. The article explores the consequences of the Nazi economic genocide of the Belarusian peasantry. The use of the little-known source base, mainly of German origin, and modern scientific research, including foreign ones, have presented new opportunities for an objective presentation of the tragic history of the destruction of the Belarusian countryside, economic exploitation and loss of civilian population in the course of punitive operations and extermination of its inhabitants by the occupiers, in whole or in part, during the German occupation of Belarus in 1941-1944.
Keywords: Belarusian peasantry, villagers, genocide, civilian population, Nazi policy, economic genocide

Год гістарычнай памяці стаў у нашай дзяржаве знакавай вяхой у асэнсаванні трагічных падзей гісторыі Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівае значэнне гэтаму аспекту ваеннага мінулага надала дзейнасць Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, якая з 2021 года праводзіць расследаванне ў рамках крымінальнай справы па фактах генацыду беларускага народа ў гады нацысцкай акупацыі.

Мэтай прапанаванага артыкула аўтар бачыць навуковы аналіз малавядомых дакументальных крыніц для паказу маштабаў нацысцкага эканамічнага генацыду беларускага сялянства ў 1941–1944 гадах. Такі падыход

**ПРА АЎТАРА**

НОВІКАЎ Сяргей Яўгеньевіч.

Нарадзіўся ў 1954 годзе ў в. Радзіца Крупскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1980).

З 1980 года працуе ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце: выкладчыкам, старшым выкладчыкам, дацэнтам, загадчыкам кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму, з 2023 года – загадчык кафедры гісторыі і сацыяльных навук, прафесар.

Кандыдат гістарычных навук (1986), дацэнт (1990).

Аўтар звыш 400 навуковых работ, у тым ліку пяці манаграфій, больш як дзесяці калектыўных работ, а таксама аўтар вучэбных выданняў для агульнаадукацыйных устаноў і ўстаноў вышэйшай адукацыі.

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, айчыннае і замежнае ваеннае крыніцазнаўства, ваенна-гістарычная антрапалогія, германская гістарыяграфія, гістарыяграфічная і крыніцазнаўчая кампаратывістыка.

з'яўляецца цалкам інавацыйным, паколькі дазваляе фактычна ўпершыню вылучыць, класіфікаваць і паказаць наступствы эканамічнай эксплуатацыі, рабавання і фізічнага знішчэння адной з канкрэтных груп насельніцтва – сялянства. Да гэтага часу ў беларускай гістарычнай навуцы гэта тэма ў такім ракурсе не даследавалася.

## Грамадзянскае насельніцтва БССР у эканамічных планах нацыстаў

Тэрмін «генацыд», уведзены ў навуковы зварот пасля Другой сусветнай вайны Р. Лемкіным, дазваляе нам разглядаць нацысцкую эканамічную палітыку як акт генацыду, паколькі наўмыснае стварэнне для якой-небудзь групы такіх жыццёвых умоў, якія вядуць да яе поўнага ці частковага фізічнага знішчэння *[1]*, і вылучаць яе як заведама намечаныя наўмысныя дзеянні з боку германскіх захопнікаў у рамках выканання імі сваіх злачынных планаў на акупаванай тэрыторыі Беларускай ССР *[2–6]*.

Менавіта яны былі занатаваны ў малавядомым шырокай чытацкай аўдыторыі нямецкім дакуменце – «плане Бакэ», дзяржаўнага сакратара Імперскага міністэрства харчавання і сельскай гаспадаркі, кіраўніка шэфгрупы ўпаўнаважанага па Чатырохгадовым плане Трэцяга рэйха рэйхсмаршала Герынга. Заўважым, што вылучаючы ў якасці цэнтральнай стратэгію харчовага забеспячэння германскага вермахта, Г. Бакэ зыходзіў з дырэктыўных указанняў аб вядзенні вайны на ўсходзе, калі ў ходзе яе ўвесь германскі вермахт будзе забяспечаны харчаваннем з захопленай савецкай тэрыторыі, нягледзячы на тое што дзясяткі мільёнаў людзей будуць асуджаны на голад *[7, с. 23]*. Гэты дакумент згадваўся ў час Нюрнбергскага судовага працэсу супраць галоўных ваенных злачынцаў.

У дачыненні да мірных жыхароў БССР «план Бакэ» прадугледжваў знішчэнне больш за палову насельніцтва, якое павінна было памерці толькі з прычыны недахопу прадуктаў харчавання *[8, S. 236]*. Яшчэ да пачатку ваеннай агрэсіі ў імперскіх кабінетах Трэцяга рэйха планавалася, што шляхам галоднай смерці памруць 100 % гарадскога насельніцтва – 2 млн чалавек (19 % ад агульнай колькасці жыхароў перадваеннай БССР), а таксама палова сельскага насельніцтва, ці 4,3 млн чалавек (паводле звестак, у вёсцы пражывала 8,6 млн чалавек, або 81 % ад усіх жыхароў уз'яднанай краіны). Такім чынам, з перадваеннай колькасці насельніцтва рэспублікі 6,3 млн чалавек павінны былі памерці ад голаду. Як вынікала з сакрэтнага дакумента нацысцкай Германіі, задуманы план асуджаў на голад большую палову насельніцтва БССР *[3, S. 48]*.

Гэты план знайшоў адлюстраванне ў дакументах групы сельскай гаспадаркі, вядомых як «Эканамічныя дырэктывы гаспадарчай арганізацыі „Усход“» ад 23 мая 1941 года, якая планавала з пачаткам вайны атрымліваць у сваё карыстанне лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі *[9, с. 35]*. Маштабы злачыннага плана былі зафіксаваны дырэктывамі, падрыхтаванымі па ўказанні Г. Бакэ, які бачыў вырашэнне задачы не праз павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і такім чынам забеспячэння ваенных паставак збожжа і бульбы для часцей вермахта, а шляхам зніжэння норм спажывання прадуктаў сельскай гаспадаркі насельніцтвам акупаваных тэрыторый.

Эканамічны генацыд беларускага насельніцтва планавалася пачаць у ходзе ваеннага паходу нацысцкай Германіі на ўсход. Згаданы вышэй план і іншыя нямецкія дакументы з'яўляюцца прамым доказам таго, што эканамічны фактар ператвараўся ў галоўную прыладу знішчэння, якая знайшла фактычнае ўвасабленне ў шматлікіх злачынствах у дачыненні да жыхароў беларускіх вёсак.

## Аб'екты, суб'екты і прадметы германскай эканамічнай палітыкі

Падтрыманы вышэйшым палітычным кіраўніцтвам Трэцяга рэйха вярхоўным камандаваннем вермахта план голаду стаў асновай германскай эканамічнай палітыкі ў СССР *[10, S. 658]*. Аналіз нямецкіх дакументаў галоўных выканаўцаў гэтай палітыкі – эканамічнага штаба «Усход» (Wi Stab Ost), гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» (Wi In Mitte) і звыш 10 гаспадарчых каманд (Wi Kdos) – закладвае падмурак для высновы: з пачаткам аперацыі «Барбароса» сельская гаспадарка акупаванай тэрыторыі БССР з'яўлялася аб'ектам нацысцкай эканамічнай палітыкі

і гаспадарчай дзейнасці вайсковых аддзелаў, гаспадарчых каманд і іх філіялаў, а таксама нарыхтоўчых службаў, спецыяльных аддзелаў галоўнага кватэрмайстра, ахоўных дывізій і палявых камендатур, якія забяспечвалі харчаваннем вайсковыя часці ў тыле групы войскаў «Цэнтр» з нарыхтоўчай акругі «Днепр», куды ўваходзіла ўсходняя частка тэрыторыі БССР.

Першымі службамі, якія распачалі сваю гаспадарчую дзейнасць на тэрыторыі Беларускай ССР, былі гаспадарчыя каманды «Белгард» (Мінск), «Хіршберг» (Віцебск), «Бунцлаў» (Бабруйск), «Швейдніц» (Орша), якія прызначаліся ў далейшым для выканання сваіх функцый на расійскай тэрыторыі з улікам сваіх назваў: «Хіршберг» (Масква), «Бунцлаў» (Тула), «Швейдніц» (Горкі) *[11, с. 120]*. Пры гэтым германскія гаспадарчыя структуры ўсіх узроўняў кіраваліся эканамічнымі дырэктывамі па забеспячэнні вермахта з захопленай краіны *[12]*. Паводле ацэнкі вядомых савецкіх даследчыкаў М.М. Загарулькі і А.Ф. Юдзянкова, на часова акупаванай тэрыторыі СССР была ўстаноўлена цэлая сістэма эканамічнага зняволення і знішчэння *[13, с. 125]*.

Зыходнай пазіцыяй для ўсіх ваенна-гаспадарчых органаў з'яўляліся дырэктыўныя ўказанні аб харчовым забеспячэнні групы армій «Цэнтр»: штодзённыя пастаўкі для яе (на канец жніўня 1941 года) складалі 1200 галоў буйной рагатай жывёлы (20 %), 7500 ц збожжа (20 %), 24 000 ц бульбы, 9600 ц алею і тлушчаў, 24 000 ц аўса і 20 000 ц сена. Пры гэтым калі ваенна-эканамічнае кіраўніцтва германскага Рэйха першапачаткова патрабавала ад нарыхтоўчых службаў забяспечыць ⅔ харчовых паставак для вермахта ў сельгаспрадукцыі, атрыманай з акупаваных тэрыторый, то з сярэдзіны верасня 1941 года – на 100 % *[14]*. Гэта фактычна ставіла беларускае сялянства на грань галоднай смерці.

Пасля правядзення ўліку насельніцтва, якое заставалася на акупаванай тэрыторыі, у канцы 1941 года эканамічным штабам «Усход» быў вызначаны агульны аб'ём паставак сельгаспрадукцыі для тэрыторыі групы армій «Цэнтр». Адказнасць за рашэнне задачы харчовага забеспячэння армейскіх часцей была ўскладзена на ваенна-гаспадарчыя службы вермахта, грамадзянскую адміністрацыю, а таксама на канторы Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Усход» (ЦГТ «Усход») *[15]*.

Для беларускага селяніна ўстанаўліваліся абавязковыя нормы здачы прадуктаў, якія не з'яўляліся пастаяннымі. Напрыклад, першапачаткова сярэдняя норма па збожжы для раёнаў Мінска і Брэста складала 3 ц з 1 га, у раёне гаспадарчай інспекцыі «Цэнтр» – ад 100 да 180 кг, па бульбе – ад 2 да 12 ц з 1 га *[16]*. У раёне Бабруйска трэба было здаць 4 ц збожжа і 15 ц бульбы з 1 га, а таксама 80 кг мяса і 400 л малака з аднаго двара. У 1942/43 гаспадарчым годзе гэтыя лічбы

**Прамысловыя вытворчасці і гаспадарчыя прадпрыемствы нарыхтоўчай акругі «Мінск»**
Крыніца: НАРБ. – Ф. 378. Воп. 1. Спр. 219. Арк. 57.



57

Industrien und Wirtschaftsunternehmen
im Bezirks des VA Minsk

| Dienststelle | Werk | In Betrieb ja / nein | Belegschaft |
|---|---|---|---|
| Bieniakonie | Sägewerk | ja | 40 |
| | Mühle | ja | 7 |
| | Sägewerk Wielki Soleizniki | ja | 50 |
| Bobruisk Ost | Holzindustrie | ja | 2100 |
| | Maschinenfabrik | ja | 400 |
| | Fahrzeugfabrik | ja | 375 |
| | Glashütte Gluscha | ja | 400 |
| | Lumpensortieranstalt | ja | 85 |
| | Ziegelei | ja | 70 |
| | Sch.e.lenwerk | ja | 100 |
| Borisow | Sägewerk Beresina | ja | 800 |
| | " Alt-Borisow | ja | 180 |
| | " Neu-Borisow | ja | 125 |
| | Elektrizitätswerk | ja | 400 |
| | Kolofoniumfabrik | ja | 40 |
| | Papierfabrik | ja | 70 |
| | Metallwerke | ja | 300 |
| | Streichholzfabrik | ja | 450 |
| | Glasfabrik | ja | 290 |
| | Klavierfabrik | ja | 200 |
| | Tonwarenfabrik | ja | 50 |
| | Filzstiefelfabrik | ja | 20 |
| | Seifenfabrik | ja | 14 |
| | Furnierfabrik | ja | 70 |
| | Lederwarenfabrik | ja | 50 |
| | Limonadenfabrik | ja | 80 |
| | Kienölfabrik | ja | 40 |
| Fanipol | Torfwerk Energia | ja | 150 |
| | " Truperstechina | ja | 150 |
| | " Iskra | ja | 150 |
| Gawia | Sägewerk in Iwie (Kleinbahn) | ja | 40 |
| Glebokie | Sägewerk | ja | 15 |
| | Ölmühle | ja | 40 |

для генеральнай акругі «Беларусь» складалі: 85 кг збожжа з 1 га, 160 кг бульбы, 6–7 кг мяса на кожны гектар пасяўных плошчаў. Здача сельгаспрадукцыі праводзілася з улікам графіка выканання гадавых заданняў: напрыклад, здача збожжа пачыналася з 1 жніўня, мяса – з 1 верасня, але пры гэтым за першыя тры месяцы трэба было здаць 60 % збожжа і 40 % мяса *[16–17]*. Пасля здачы абавязковых паставак у беларускай вёсцы складвалася катастрафічная сітуацыя: на аднаго чалавека ў сярэднім заставалася толькі 100 кг збожжа і крыху больш бульбы *[3, S. 245]*. У выпадку невыканання ўстаноўленых норм у дачыненні да кожнага асобнага селяніна або ўсёй вясковай абшчыны ўводзіліся штрафныя санкцыі або выкарыстоўваліся іншыя прымусовыя меры. Беларускія сяляне заставаліся без прадуктаў і былі асуджаны на галодную смерць *[17]*.

Невыкананне абавязковых паставак было толькі адным з бакоў агульнай праблемы па забеспячэнні германскага вермахта з захопленых усходніх тэрыторый. Другі бок праблемы – узрастанне страт нарыхтаванай прадукцыі. Так, калі ў 1941/42 гаспадарчым годзе страты сельгаспрадукцыі былі нязначнымі, то з 1942 года яны павялічваліся: галоўная прычына – узмацненне барацьбы партызан і мясцовага насельніцтва супраць непасільных заданняў і паставак сельскагаспадарчай прадукцыі. Агульныя вынікі выканання планавых заданняў на 1942/43 гаспадарчы год з беларускіх тэрыторый інспекцыі «Цэнтр» і генеральнай акругі «Беларусь» склалі: па збожжы – 40 і 41 % адпаведна, па мясу – 36 і 25, па маслу – 45 і 80, па тлушчах – 70 і 68 % *[11, с. 127]*. Апроч таго, германскія акупанты не спыняліся ў выбары сродкаў, метадаў і форм атрымання сельгаспрадукцыі ад беларускага сялянства, выкарыстоўваючы цягам 1942–1943 гадоў вайсковыя нарыхтоўчыя службы, ваенна-паліцэйскія фарміраванні і падраздзяленні СС для атрымання харчовай прадукцыі сельскай гаспадаркі за кошт рэсурсаў сялянства *[18]*. У ходзе правядзення карных акцый шматлікія вёскі перасталі існаваць як аб'екты эканамічнага рабавання, паколькі зніклі з твару беларускай зямлі разам з іх галоўным суб'ектам – мірнымі жыхарамі.

## Формы і метады працоўнага выкарыстання беларускага сялянства

У адпаведнасці з загадам фельдмаршала Г. фон Клюге «Аб нарыхтоўцы ўраджаю» ад 27 ліпеня 1943 года, уборачная павінна праводзіцца ў поўную сілу і да выканання работ неабходна прыцягнуць насельніцтва не толькі вёсак, але і гарадоў. Ураджай павінен быць убраны своечасова, абмалочаны і накіраваны на задавальненне заказаў вермахта і насельніцтва Рэйха. У загадзе эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» «Аб нарыхтоўцы ўраджаю 1943/44» ад 2 жніўня 1943 года ўсім гаспадарчым службам, вайсковым і ахоўным часцям прадпісвалася: 1) накіроўваць максімальную колькасць людзей для правядзення ўборачных работ; 2) устанавіць натуральную плату за кожны адпрацаваны працадзень для мясцовага насельніцтва; 3) накіроўваць на біржы працы заяўкі на прыцягненне гарадской працоўнай сілы і інш.

З дакументаў вынікае, што для германскай ваеннай адміністрацыі і яе гаспадарчых службаў вызначальнымі заставаліся дырэктыўныя задачы «Зялёнай папкі» аб забеспячэнні вермахта з рэсурсаў захопленай краіны *[19]*. Таму сельская гаспадарка і жыхары беларускіх вёсак з'яўляліся адначасова і галоўным вытворчым суб'ектам, і цэнтральным аб'ектам германскай эканамічнай эксплуатацыі на захопленай тэрыторыі. Вайсковыя часці вермахта са сваімі гаспадарчымі службамі імкнуліся атрымаць як мага больш прадуктаў харчавання з занятых раёнаў і не дапусціць зніжэння паставак сельскагаспадарчай прадукцыі як для патрэб вермахта, так і насельніцтва Германіі. Так ажыццяўлялася нацысцкая ўстаноўка на тое, каб дзясяткі мільёнаў людзей галадалі, але вермахт пры гэтым забяспечваўся ўсім неабходным з захопленай тэрыторыі *[20, S. 64]*.

Галоўнай прычынай невыканання гаспадарчых заданняў і недапаставак прадукцыі сельскай гаспадаркі ў дакументах вызначаны пастаянна ўзрастаючы ўплыў дзейнасці партызан. У выніку значнага росту іх аператыўнай актыўнасці страты нямецкіх гаспадарчых службаў на тэрыторыі Беларусі і эканамічнай інспекцыі «Цэнтр» склалі: каля 60 % збожжа, 54 % мяса, 70 % тлушчаў ад запланаванага задання *[21, Bl. 43; 22, Bl. 49]*. На працягу 1943 года намецілася рэзкае скарачэнне вытворчых магутнасцей па выпуску сельгаспрадукцыі на тэрыторыі генеральнай акругі «Беларусь» *[22, Bl. 49–51]*. Пры гэтым у дакументах нарыхтоўчых службаў

адзначалася, што ў пачатку 1943 года мясцовае насельніцтва выконвала абавязковыя заданні толькі па асобных відах ваенных паставак, напрыклад па сену – на 100 %, бульбе – на 150 %, а па мясу практычна адсутнічалі рэзервы для іх выканання. Адзіным варыянтам такіх нарыхтовак станавіліся карныя аперацыі супраць насельніцтва *[23, Bl. 83; 24, Bl. 190; 25, Bl. 312]*.

Апроч таго, сітуацыя па харчовым забеспячэнні часцей вермахта групы армій «Цэнтр» ускладнялася, бо значная колькасць сельскіх жыхароў выкарыстоўвалася на будаўніцтве ваенных умацаванняў «лініі пантэр», таму не хапала працаздольнага насельніцтва для правядзення ўборкі ўраджаю і бульбы. Выйсце са становішча кіраўніцтва гаспадарчых каманд знаходзіла ў прыцягненні да гэтых работ дзяцей і старых. Адной з асаблівасцей выканання заданняў па нарыхтоўцы прадуктаў восенню 1943 года з'яўлялася падрыхтоўка да эвакуацыі ў Рэйх ужо сабранай сельгаспрадукцыі і выгану буйной рагатай жывёлы, коней, свіней, авечак і г. д. *[26, Bl. 37]*. Як адзначае нямецкі даследчык К. Герлах, сярод прычын невыканання заданняў па ваенных пастаўках сельскагаспадарчай прадукцыі на першае месца выходзіла дзейнасць партызан *[3, S. 250]*.

## Эканамічнае рабаванне вяскоўцаў

Дакументы сведчаць, што правядзенне нарыхтовак усё часцей зрывалася з прычыны актывізацыі партызанскай барацьбы. Так, у справаздачы аб гаспадарчым становішчы ў генеральнай акрузе «Беларусь» ад 7 верасня 1943 года адзначалася, што па выніках выканання 1942/43 гаспадарчага года было нарыхтавана (у % ад запланаванага): збожжа – 81,5 %, саломы – 80 %, сена – 83,9 %, бульбы – 62,2 %, тлушчаў – 38,5 %, ільнасемя – 82,5 %. З гэтых аб'ёмаў у выніку дзейнасці партызан было страчана: збожжа – 15 %, саломы – 50 %, сена – 41 %, бульбы – 5,4 %, мяса – 11,2 %, тлушчаў – 10 %. Акупанты праводзілі спецыяльныя нарыхтоўчыя і карныя аперацыі, падчас якіх сілай забіралася сельскагаспадарчая прадукцыя *[27, с. 376]*.

У выніку актывізацыі дзейнасці партызанскага супраціўлення на тэрыторыі Беларусі рэзка знізіліся сельскагаспадарчыя плошчы, якія знаходзіліся пад кантролем акупантаў. Так, калі гаспадарчыя каманды «Віцебск» і «Орша» першы гаспадарчы год выканалі на 35 % ад агульнага аб'ёму заданняў па сельгаспрадуктах і фуражу, то праз год (на 3 чэрвеня 1943 года) сітуацыя радыкальна змянілася: на тэрыторыі каманды «Віцебск» пасяўныя плошчы зменшыліся ў 4,9 раза, у той час калі ўсе сельскагаспадарчыя ўгоддзі, якія выкарыстоўваліся, скараціліся ў 5,2 раза *[28]*, сярэдняя ўраджайнасць збожжавых складала ў сярэднім крыху больш за 7 ц з га *[29]*.

У 1943 годзе ў цэнтры ўвагі выканаўчых органаў на акупаванай тэрыторыі Беларусі заставалася не столькі нарыхтоўка сельгаспрадукцыі, колькі планавая яе вытворчасць і перапрацоўка, прычым сіламі мясцовых жыхароў. Так, у канцы 1943 года колькасць гэтых прадпрыемстваў склала звыш трох тысяч, асноўнай працоўнай сілай было мірнае насельніцтва. Найбольш буйныя вытворчасці па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі знаходзіліся ў Мінску *[30]*. Па колькасці спецыялістаў, кваліфікаваных рабочых і навучэнцаў, а таксама занятага тэхнічнага і абслуговага персаналу самымі вялікімі прадпрыемствамі ў жніўні 1943 года былі: Мінскі піўзавод – 252 чалавекі (з іх рабочых – 219), хлебазавод «Аўтамат» – 247 (204), мукамольны камбінат № 4 – 176 (128), малаказавод – 151 (106). Самым вялікім прадпрыемствам у сістэме ЦГТ з'яўлялася бойня ў Мінску, дзе на канец чэрвеня 1943 года былі заняты 339 чалавек *[31]*.

Статыстычныя справаздачы эканамічнага штаба «Усход» даюць магчымасць убачыць агульную карціну па выкананні асноўных харчовых паставак з Беларусі ў рамках планавых заданняў на 1942/43 і 1943/44 гаспадарчыя гады. Так, у генеральнай акрузе «Беларусь» заданне па збожжы за гады акупацыі было выканана толькі на 41 % (у рэйхскамісарыяце (РК) «Остланд» – на 83 %, у РК «Украіна» – на 106 %). Агульны аб'ём нарыхтаванага збожжа (без фуражу), адпраўленага вермахту і ў Рэйх з Беларусі (без уліку генеральных акруг «Валынь», «Падолія» і «Жытомір» РК «Украіна») склаў 46,9 % ад першапачатковых заданняў *[32]*.

На тэрыторыі акупаванай Беларусі была створана таксама «сістэма пабораў» мясцовага насельніцтва *[27, с. 379]*. З гэтай мэтай акупацыйныя ўлады ўсталявалі: 1) сістэму натуральных і грашовых падаткаў,



**На акупаванай тэрыторыі БССР нацысты ажыццяўлялі загаддзя спланаваную сістэму эканамічнага зняволення і знішчэння сялянства: вермахт забяспечваўся неабходнай сельгаспрадукцыяй, а жыхары беларускіх вёсак асуджаліся на галодную смерць. 1942 год**

2) сістэму гвалтоўных выняткаў, 3) сістэму прымусовых паставак. Пры гэтым колькасць падаткаў і страхавых выплат не была пастаяннай і залежала ў асноўным ад мясцовай адміністрацыі. Напрыклад, з насельніцтва Пінскай акругі на працягу амаль трох гадоў акупацыі збіралася 19 розных відаў страхавых выплат і падаткаў, што склала суму 98 264 456,37 рубля/карбованца *[27, с. 379]*. З сельскага насельніцтва (уключаючы асоб маладзейшых за 16 гадоў і старэйшых за 55 гадоў), якое не атрымлівала зарплаты, вылічаўся падушны падатак, які складаў аснову валасных бюджэтаў *[33, с. 166]*.

Але ні прымусовыя меры, ні штрафныя санкцыі, ні спробы ўвядзення новага парадку землекарыстання, ні пастаўкі селекцыйных сартоў збожжа, ні замена племянной жывёлы, ні ўвоз сельгасмашын і г. д. – нішто з таго, што выкарыстоўвалася германскімі акупацыйнымі органамі і іх гаспадарчымі структурамі, не прывяло да поўнага выканання «дырэктыў па вядзенні гаспадаркі» на тэрыторыі Беларусі *[34]*.

Аднак у выніку татальнай эксплуатацыі беларускай вёскі былі катастрафічна скарочаны яе вытворчыя рэсурсы. У сучаснай германскай гістарыяграфіі 1943 год называецца найвышэйшай кропкай вайны супраць беларускіх сялян, г. зн. гаспадарчага рабавання вясковых жыхароў *[3, S. 943]*.

## Маштабы трагедыі жыхароў беларускіх вёсак

Аб маштабах эканамічных злачынстваў германскіх акупацыйных ваенна-гаспадарчых органаў сведчаць дакументы Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі (НДзК): у гады германскай акупацыі ў насельніцтва Беларусі рэквізавалі, забілі і сагналі буйной рагатай жывёлы, коней, свіней, авечак і коз – 5638 тыс. галоў на агульную суму 4096 млн рублёў, канфіскавалі запасаў збожжа, мукі, бульбы, агародніны і садавіны – 5130 тыс. тон на суму 3100 млн рублёў. Склад маёмаснай шкоды ў грашовым выражэнні, прычыненай калгасам, саўгасам і МТС Беларускай ССР нямецка-фашысцкімі акупантамі, вымяраецца агульнай сумай у 22 471,943 млн рублёў *[35, с. 420–423]*.

У выніку татальнай эксплуатацыі і правядзення палітыкі эканамічнага генацыду ў беларускай вёсцы былі катастрафічна скарочаны яе чалавечыя рэсурсы. Паводле звестак НДзК, за тры гады акупацыі германскімі захопнікамі і іх памагатымі спалены 9200 сёл і вёсак, 5295 з іх нацысты знішчылі разам са ўсім ці часткай насельніцтва. З 5295 вёсак – 3 % было знішчана ў 1941 годзе, 16 % – у 1942-м, 63 % – у 1943-м, 18 % – у 1944 годзе *[36, с. 8–9]*. У выніку правядзення нацысцкай палітыкі генацыду і тактыкі «выпаленай зямлі» агульная

колькасць страт складала 1 547 000 чалавек грамадзянскага насельніцтва БССР *[37, с. 107]*. Але каб зразумець маштаб трагедыі жыхароў беларускай вёскі, нам неабходна ведаць адказ аб колькасці гэтых людзей, якія сталі ахвярамі нацысцкага генацыду.

У сваю чаргу аніякімі лічбамі немагчыма вымераць маштаб чалавечай трагедыі сялянства БССР, якое вынесла на сабе ўвесь цяжар гаспадарчых рэквізіцый, рабавання, разбурэнняў, гвалту і злачынстваў, г. зн. эканамічнага генацыду. Беларускае сялянства, якое апынулася пад акупацыяй, вымушана было прайсці выпрабаванні не толькі германскім ваенна-паліцэйскім рэжымам, але і нацысцкай практыкай ваенна-эканамічнага прымусу, насілля, эксплуатацыі і голаду. Аднак нават у такіх фатальных умовах генацыду менавіта сялянства БССР як магло забяспечвала сельскагаспадарчай прадукцыяй шматтысячнае войска беларускіх партызан *[38, с. 120]*.

Такім чынам, аб'ектыўнае вывучэнне наступстваў генацыду мірнага насельніцтва, у тым ліку беларускага сялянства, патрабуе выкарыстання не толькі новай метадалагічнай, але і пашыранай дакументальнай базы для правядзення скрупулёзнага аналізу планаў, рэальных дзеянняў і злачынных наступстваў германскіх захопнікаў на ўсходзе ў цэлым і на акупаванай тэрыторыі БССР у прыватнасці. У выніку праведзенага намі даследавання можна абгрунтаваць выснову аб неабходнасці вылучэння асобнага напрамку ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі і важнасці яго далейшай распрацоўкі на аснове прыцягнення новых крыніц рознага паходжання і неабходнасці выкарыстання метаду кампаратыўнага аналізу дакументаў абодвух бакоў.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.10.2023 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Что такое геноцид? [Электронный ресурс] // Энциклопедия Холокоста. – Режим доступа: https://encyclopedia.ushmm.org/content/ru/article/what-is-genocide. – Дата доступа: 26.01.2023.
2. Gerlach, Ch. Krieg, Ernährung, Völkermord. Forschungen zur deutschen Vernichtungspolitik im Zweiten Weltkrieg / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1998. – 280 S.
3. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtsschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
4. Zarusky, J. Timothy Snyder „Bloodlands". Kritische Anmerkungen zur Konstruktion eine Geschichtslandschaft / J. Zarusky // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – Heft 1. – Januar 2012. – S. 1–31.
5. Соколова, Е. Хищнические планы и чудовищные методы Третьего рейха по эксплуатации оккупированной территории БССР / Е. Соколова // Беларуская думка. – 2022. – № 2. – С. 71–78.
6. Литвин, А. Геноцид: истребление белорусского народа в годы нацистской оккупации (июнь 1941 – июнь 1944) / А. Литвин // Беларуская думка. – 2022. – № 4. – С. 68–77.
7. Дашичев, В.И. Стратегия Гитлера – путь к катастрофе, 1933–1945: ист. очерки, док. и мат.: в 4 т. / В.И. Дашичев. – М.: Наука, 2005. – Т. 3: Банкротство наступательной стратегии в войне против СССР 1941–1943. – 607 с.
8. Engelhardt, E. von. Weißruthenien. Volk und Leute / E. von Engelhardt. – Amsterdam, Prag, Wein: Verlag Berlin, 1943. – 358 S.
9. Новікаў, С.Я. Эканамічная палітыка нацысцкай Германіі ў Беларусі 1941–1944: агляд крыніц і германскай гістарыяграфіі 1990-х гадоў / С.Я. Новікаў. – Мінск: МДЛУ, 2002. – 219 с.
10. Penter, T. Der Holodomor, die NS-Propaganda in der Ukraine und ihr schwieriges Erbe / T. Penter, D. Tytarenko // Vierteljahrshefte für Zeitgeschichte. – Heft 4. – Oktober 2021. – S. 633–667.
11. Новиков, С.Е. Осуществление экономической политики оккупантов / С.Е. Новиков // Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А.А. Коваленя (руководитель авторского коллектива), А.М. Литвин, В.И. Кузьменко [и др.]. – Мн.: БЕЛТА, 2005. – С. 116–132.
12. Федэральны ваенны архіў Германіі (BA-MA). – RW 31/128: Richtlinien für die Führung der Wirtschaft in der neubesetzten Ostgebieten (Grüne Mappe). Teil I: Aufgeben und Organisation der Wirtschaft (1. Auflage). Bl. 11.
13. Загорулько, М.М. Крах плана «Ольденбург»: о срыве экономических планов нацистской Германии на временно оккупированной территории СССР / М.М. Загорулько, А.Ф. Юденков. – 3-е изд., доп. – М.: Экономика, 1980. – 376 с.

14. BA-MA. – RW 30/37. Einsatz des Wi Kdo Minsk. Erfahrungsbericht des Hptm Dorn v. 28.8.41. Bl. 3 R.
15. Федэральны архіў Германії ў Берліне (BA). – R 93/20. Der GenKW in Minsk: Protokoll über die Tagung der Gebietskommissare, HA-Leiter u. Abt.-Leieter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10. April 1943. Bl. 27665.
16. BA. – R 93/7: Der GenKW in Minsk, Abt. III E 2, Az. II D 100, Bl. 9.
17. Расійскі дзяржаўны ваенны архіў (РДзВА). – Ф. 700 к. Воп. 2, Спр. 4. Wi Stab Ost, Stab Abt. I/Ic, Br. Nr. 69700/43, Monatsbericht Wi Stab Ost (1.10.–31.10.1943).
18. BA-MA. – RW 31/309: Wi In Mitte, Stab I/Ib/Rü, Chefgruppen A, BB, FH, W, La – Br.B. Nr. 1892/43 geh.: Ernteerfassung 1943/44 vom 2.8.1943. Bl. 31.
19. BA-MA. – RW 31/128: Richtlinien für die Führung der Wirtschaft in den neubesetzten Ostgebieten (Grüne Mappe), Teil I: Aufgaben und Organisation der Wirtschaft, Juni 1941, 1. Auflage. Bl. 2.
20. Verbrechen der Wehrmacht: Dimension des Vernichtungskrieges 1941–1944: Ausstellungskatalog. – Hamburg: Hamburger Edition, 2002. – 749 S.
21. BA-MA. – RW 31/84: Die Aufgaben und Leistungen der landwirtschaftlichen Verwaltung in den besetzten Ostgebieten (mit Anlagen). Bl. 43.
22. BA-MA. – RW 31/287: Erfassungsmeldungen im Wirtschaftsjahr 1943/44: RMfbO, IIIE 3 b/2370-23914/43 vom 30.7.43. Bl. 49–51.
23. BA-MA. – RW 31/28: Bericht über die Dienstreise Chef Wi Stab Ost vom 25.–31.3.1943: Wi Stab Ost, Nr. 66430/43 geh., vom 3. April 1943. Anlage 312. Bl. 83.
24. BA-MA. – RW 31/566: KTB Wi In Mitte vom 1. April 1943 bis 30. Juni 1943: Anlage 3: Personelle und materielle Verluste in der Landwirtschaft im Bereich der Wirtschaftsorganisation Mitte. Bl. 190.
25. BA-MA. – RW 31/303b: Wi Stab Ost: Anlage zu Monatsbericht für Mai 1944: Anlage 3: Schätzung des Viehbestandes im Bereich der He Wi Fü Mitte, Mai 1944. Bl. 312.
26. BA-MA. – RW 31/799: KTB des Wi Kdo 206 (Witebsk) vom 1.10.1943 bis 9.1.1944: Vierteljahresbericht zum Kriegstagebuch für die Zeit vom 1.10.–31.12.1943: Gruppe La. Bl. 37.
27. Новиков, С.Е. Ужесточение нацистского оккупационного режима на территории Беларуси / С. Е. Новиков // Страна в огне: в 3 т. – Т. 2: Коренной перелом. 1942–1943: в 2 кн. / отв. ред. А.М. Литвин, Ю.А. Никифоров – М.: «Абрис», 2018. – Кн. 1: Очерки. – С. 360–428.
28. НАРБ. – Ф. 412. Воп. 1. Спр. 134: Wi In Mitte, Chefgruppe La, 1b 5, Bäuerliche Gemeinwirtschaften und Staatsgüter, 3. Juni 1943. Арк. 5.
29. РДзВА. – Ф. 700-К. Воп. 2. Спр. 4: Wi Stab Ost, Stab Abt. I/Ic, Nr. 69700/43, Monatsbericht Wi Stab Ost für den 1.10.–31.10.1943. – Арк. 11, 11 адв.
30. НАРБ. – Ф. 398. Воп. 2. Спр. 7, ZHO, Aufstellung von allen Betrieben der ZHO Treuhand für den 15.11.43. – Арк. 37–47, 75–77.
31. НАРБ. – Ф. 398. Воп. 2. Спр. 7: Aufstellung von allen Betrieben der ZHO Treuhand für den 15.11.43. Арк. 37.
32. BA-MA. – RW 31/84: Getreide-, Fleisch- und Fettauflagen und ihre Erfüllung in den Wirtschaftsjahren 1941/42, 1942/43 und 1943/44 (in Tonnen), Anlage 27.
33. Літвін, А.М. Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг. / А.М. Літвін, Я.А. Грэбень, С.Я. Новікаў; агул. рэд. А.М. Літвіна. – Мінск; Тэсей, 2010. – 584 с.
34. BA. – R 93/13: GebK Slonim, Tätigkeitsbericht für die gesamte Zeit seit Übernahme des Gebietes in die Zivilverwaltung v. 10. August 1944. Bl. 5.
35. Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии 1941–1944 / Центр. гос. архив Окт. революции и социалист. стр-ва БССР, Ин-т истории акад. наук БССР, Ин-т истории партии при ЦК КПБ – фил. ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС; сост. З. И. Белуга и др. – Минск: Беларусь, 1965. – 456 с.
36. Сожженные деревни Белоруссии, 1941–1944: Документы и материалы / сост. Н.В. Кирилова, В.Д. Селеменев и др. – М.: Фонд «Историческая память», 2017. – 512 с.
37. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны = Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны = Belarusian State Museum of the History of the Great Patriotic War / Г.В. Галінская [і інш.]. – Мінск: Звязда, 2015. – 396 с.
38. Новиков, С.Е. Начало нацистского экономического геноцида на оккупированной территории Белорусской ССР (1941–1942 гг.) / С.Е. Новиков // Неизвестные страницы истории нацистской оккупации регионов РСФСР и БССР: сборник докладов Российско-белорусского круглого стола, 21 октября 2021 г. / отв. ред. Ю.З Кантор, ред. Ю.И. Мошник. – СПб.: Санкт-Петербургский институт истории РАН, 2022. – С. 113–120.